ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (1231)

ЧАЦВЕР 15 лютага 1979 г.

Цана 2 кап.

ПА БДУ

інфармацыя

## У савеце

На пасяджэнні савета БДУ былі разгледжаны пытанні: «Вынікі навукова - метадычнай работы за 1977-78 навучальны год і задачы па яе ўдасканаленні і павышэнню эфектыўнасці», «Вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці універсітэта за 1978 год і каштарыс расходаў на 1979 год» і іншыя пытанні. З дакладам па першаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў. У спрэчках па дакладу выступілі: Р. І. Вадэйка, загадчык кафедры псіхалогіі, дацэнт; А. М. Саржэўскі, загадчык кафедры агульнай фізікі, прафесар; дэкан механіка - матэматычнага факультэта А. С. Фядэнка; загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі, прафесар Ю. С. Багданаў; рэктар БДУ, акадэмік У. А. Белы.

Па другому пытанню выступілі выконваючая абавязкі галоўнага бухгалтара В. Г. Маркава і начальнік планава - фінансавага аддзела Д. П. Церахаў.

## Павышаць якасць падрыхтоўкі

Важнай умовай павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца забеспячэнне высокага ўзроўню арганізацыі вучэбна - выхаваўчага працэсу. Актуальным праблемам яго ўдасканалення была прысвечана навукова - метадычная канферэнцыя, якая адбылася 5—6 лютага 1979 года ў БДУ.

Адкрыў канферэнцыю рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы. З дакладамі на пленарным пасяджэнні выступілі загадчык кафедры педагогікі, прафесар М. У. Піскуноў, які асвятліў асноўныя праблемы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у вучэбным працэсе; дэкан механіка - матэматычнага факультэта прафесар А. С. Фядэнка, які падзяліўся вопытам работы механіка - матэматычнага факультэта па павышэнню эфектыўнасці вучэбнага працэсу. З вялікай увагай быў выслухан даклад загадчыка кафедры навуковага камунізму дацэнта П. П. Дроня «Задачы камуністычнага выхавання студэнтаў у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС». Дацэнт Р. І. Вадэйка азнаёміў сабраўшыхся з асноўнымі псіхалагічнымі прынцыпамі ўздзеяння мовы лектара на кіраванне ўвагай студэнцкіх аўдыторый.

У 17 секцыях канферэнцыі было прачытана каля 300 дакладаў. Вялікая ўвага была ўдзелена ўдасканаленню планавання вучэбнага працэсу, методыцы правядзення ўсіх відаў заняткаў, арганізацыі і кантролю самастойнай работы студэнтаў, укараненню тэхнічных сродкаў навучання, удасканаленню комплекснага падыходу да камуністычнага выхавання студэнтаў, методыцы правядзення заняткаў на завочным факультэце і на вячэрнім аддзяленні. На канферэнцыі прысутнічалі намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ В. П. Кузьмінкоў, начальнік упраўлення ВНУ Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР У. Т. Воднеў, прадстаўнікі навукова-метадычнага кабінета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і прадстаўнікі ВНУ г. Мінска.

У рэкамендацыях канферэнцыі яе ўдзельнікі намецілі канкрэтныя меры па далейшай арганізацыі вучэбнага працэсу, павышэнню якасці і эфектыўнасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

С. СІНІЛАЎ.

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

# УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА

**4 сакавіка 1979 года — дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Да гэтага ўсенароднага свята рыхтуецца ўся краіна. Адразу ж пасля паведамлення ў друку аб выбарах партыйны камітэт БДУ імя У. І. Леніна пачаў праводзіць актыўную перадвыбарную прапагандысцкую работу. Было падабрана каля 30 кандыдатаў навук, дацэнтаў, якія па заданню ЦК КПБ і Мінскага АК КПБ паехалі чытаць лекцыі ў розныя раёны рэспублікі. Яны выступаюць перад працоўнымі з такімі тэмамі, як «Саветы народных дэпутатаў — палітычная аснова СССР», «Карэнныя перавагі сацыялістычнай дэмакратыі перад дэмакратыяй буржуазнай», «Адзінства правоў, свабод і абавязкаў савецкага чалавека» і інш.**

**Актыўна ўключыліся ў гэтую работу і арганізацыя таварыства «Веды» універсітэта. Ёю на заводзе імя У. І. Леніна адкрыт цыкл лекцый «Дэмакратыя савецкай выбарчай сістэмы», які разлічан на 6 месяцаў. Лекцыі прачытаюць дактары і кандыдаты юрыдычных навук. Арганізаваны калектыўныя выезды вучоных на трактарны завод і завод імя У. І. Леніна. Плануюцца выезды і на іншыя заводы і прадпрыемствы г. Мінска. Разам з тым выкладчыкі юрыдычнага факультэта рэгулярна выступаюць з лекцыямі і дакладамі на агітпунктах г. Мінска.**

**Састаўной часткай перадвыбарнай прапагандысцкай кампаніі, якая праводзілася парткомам, з'явіўся агітпрабег, прысвечаны выбарам у Вярхоўны Савет СССР. Ініцыятарамі яго правядзення выступілі камісія парткома па лекцыйнай прапагандзе і таварыства «Веды» універсітэта. Іх актыўна падтрымала праўленне таварыства «Веды» БССР.**

**У агітпрабегу прыняло ўдзел 24 чалавекі. Яго ўдзельнікі пабывалі на заводах і фабрыках, у калгасах, школах, тэхнікумах, у інтэрнатах рабочых, на агітпунктах Смалявіч, Жодзіна, Барысава, Маладзечна, Дзяржынска. За час агітпрабегу выкладчыкі кафедр гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў прачыталі 34 лекцыі і студэнты па камсамольскіх пуцёўках — 17. Актыўны ўдзел у агітпрабегу і чытанні лекцый прынялі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты П. І. Зялінскі, М. Р. Насеннік, І. Ф. Рамано ўскі, член камітэта камсамола В. Андруховіч, удзельніца XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване Т. Аўдацейка, студэнты механіка-матэматычнага факультэта і факультэта журналістыкі.**

**Ва ўсіх калектывах, дзе выступалі ўдзельнікі агітпрабегу з лекцыямі і канцэртамі, была выказана глыбокая падзяка за высокі ідэйна-тэарэтычны ўзровень лекцый і добрыя канцэрты мастацкай самадзейнасці. Слухачы выказвалі пажаданні, каб такія агітпрабегі праводзіліся рэгулярна.**

**І. СТАДУБ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшыня камісіі парткома па лекцыйнай прапагандзе.**

# Пяць напружаных дзён...

Закончыўся зоркавы агітпрабег БДУ імя У. І. Леніна і рэспубліканскага таварыства «Веды», прысвечаны выбарам у Вярхоўны Савет СССР. Пяць дзён напружанай работы: выязджалі з Мінска раніцай, а вярталіся позна вечарам, калі горад свяціўся безліччу агнёў.

У агітпрабегу ўдзельнічалі выкладчыкі, студэнты, агітбрыгада механіка-матэматычнага факультэта.

І вось удзельнікі агітпрабегу вяртаюцца з апошняй паездкі. На двары не на жарт разгуляўся вецер, замятала дарогу. «ЛАЗ», падмінаючы пад сябе снег, аддаляўся ад Дзяржынска. У аўтобусе ажыўлена, пасажыры дзеляцца ўражаннямі не толькі ад гэтай апошняй паездкі, але і ўсіх папярэдніх, падводзяць вынікі. А ўспомніць ёсць што.

Агітбрыгада механіка-матэматычнага факультэта «Ваганты» існуе чацвёрты год. Яе кіраўнік Таня Любушкіна пасля паспяховага выступлення ў 5-й сярэдняй школе горада Жодзіна расказвае:

— Наша група існавала і да таго, як ён далі гучную назву — «Ваганты». Збіраліся разам у вольны час хлопцы і дзяўчаты, спявалі, жартавалі. Членаў агітбрыгады згуртавала студэнцкае жыццё.

Якраз у гэты момант студэнтаў акружылі вучні і настаўнікі школы, задавалі пытанні аб тым, як ідзе вучоба ва універсітэце, ці цяжка вучыцца. Завуч Ала Рыгораўна Нячай звярнулася да Ігара Хоміча:

— Бачыце, на вашы канцэрты вучні часам ідуць ахвотней, чым на выступленні вядомых спевакоў. І атрымліваюць пасля іх вялікі запас энергіі, энтузіязму.

За 5 дзён агітбрыгада дала 10 канцэртаў. Якое яно, жыццё студэнтаў? Часам даводзіцца многа сядзець за падручнікамі, асабліва ў дні сесіі. Але заўсёды яно было вясёлым, шчаслівым. Так адказваюць на гэта пытанне «Ваганты» сваёй праграмай, якую вызначаюць дасціпны жарт, з густам падабраныя песні.

Агітбрыгада выступае на швейнай фабрыцы ў Дзяржынску. Гледачы размясціліся прама ў цэху ля сваіх рабочых месц. Вядучы Коля Антановіч аб'яўляе:

— А зараз выступае жаночая група мужчынскага хору.

Па цэху праходзіць лёгкі смяшок, многія ўжо здагадаліся, у чым тут справа. А калі перад рабочымі пачалі спяваць прыпеўкі юнакі, апранутыя ў сукенкі, словы песні патанулі ў буры апладысментаў, ніхто не змог стрымацца ад смеху.

Вядома, не абышлося і без кур'ёзаў. У час аднаго з выступленняў Юра Антонаў выконваў песню, і нечакана лопнула струна. Юра, нібы нічога не здарылася, даспяваў песню да канца.

Вернемся зноў у салон аўтобуса. Студэнты яшчэ раз разглядаюць падарункі, Оля Фаміных беражна трымае ў руках жывыя кветкі.

На прадпрыемствах і ва установах таго або іншага горада перад канцэртам або пасля перад сабраўшыміся чыталі лекцыі кандыдаты гістарычных навук Іван Дзям'янавіч Стадуб, Пётр Іосіфавіч Зялінскі, Міхалай Рыгоравіч Насеннік, Іван Фёдаравіч Рамано ўскі.

Тэмы іх лекцый — міжнароднае становішча, актуальныя праблемы знешняй палітыкі нашай краіны. Лекцыі вызначаліся высокім палітычным узроўнем, дасціпнасцю мовы, уменнем даказаць асноўную думку, падмацаваць яе важкімі фактамі. А каб гэтыя факты былі не ўчарашнімі, лектары раніцай, зазірнуўшы ў кіёск, набывалі свежыя газеты, толькі што выйшаўшыя часопісы і папаўнялі аб'ём інфармацыі прама ў аўтобусе.

У саставе агітбрыгады была студэнтка IV курса юрфака Тамара Аўдацейка. Яна — удзельніца XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване. Убачанае, пачутае ў час паездкі на Кубу надоўга застанецца ў памяці Тамары. І яна ахвотна расказвала аб гэтым слухачам.

Вучням шэрагу школ паведаміў аб гісторыі БДУ імя У. І. Леніна, аб яго сённяшнім дні Валянцін Андруховіч, камісар прабегу. Ён гасцінна запрасіў моладзь ісці вучыцца ў наш універсітэт.

А. ГАЙДУК.



У час агітпрабегу студэнты і выкладчыкі пабывалі ў г. Дзяржынску, сустрэліся з работнікамі швейнага камбіната.

**На здымку:** кандыдат гістарычных навук, дацэнт П. І. Зялінскі выступае перад швейнікамі.

Фота А. Стадуба.



Вялікую агітацыйную работу праводзілі ўдзельнікі агітпрабегу па набору студэнтаў. Яны расказвалі моладзі аб універсітэце, аб цікавым студэнцкім жыцці.

**На здымку:** студэнтка IV курса юрфака Т. Аўдацейка (2-я справа) гутарыць з моладдзю.

Фота А. Стадуба.



# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## ГЕАГРАФІІ



Геаграфічны факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна - метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў, таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

У саставе факультэта сем кафедр і дзве лабараторыі: праблемная навукова - даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства.

**Студэнты завочнага факультэта набываюць спецыяльнасці: фізічная геаграфія або эканамічная геаграфія. Студэнты-завочнікі, таксама як і студэнты дзённага і вячэрняга аддзяленняў, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных дысцыплін. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнаму землязнаўству, агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай тапаніміцы, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і інш.**

**Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геахімію і геафізіку ландшафтаў, фізіка-геаграфічнае раяніраванне і карціраванне, агракліматалогію і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюцца для эканоміка-географаў, — эканамічная геаграфія, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, эканамічнае раяніраванне, статыстыка, раённая планіроўка.**

Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў - географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна» — месца правядзення ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрната, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыя. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічную здымку мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебы, вызначаюць форму і размеры ўзгоркаў, нізін, іх паходжанне, вядуць назіранні за надвор'ем і г. д. Заключным этапам з'яўляецца комплексная геаграфічная практыка, якая ўключае комплексную характарыстыку прыродных умоў насельніцтва і гаспадаркі раёна. Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў увязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі выконваюцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты стацыянара, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, прадстаўляюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс. Работа з завочнікамі знаходзіцца пад пастаянным кантролем і ўвагай прафесарска-выкладчыцкага калектыву факультэта. Лекцыйныя, практычныя і семінарскія заняткі праводзяць вядучыя спецыялісты кафедр. Нярэдка для чытання лекцый запрашаюцца вучоныя АН БССР, Маскоўскага, Ленінградскага і іншых універсітэтаў.

У час вучобы завочнікі карыстаюцца літаратурай і вучэбнымі дапаможнікамі бібліятэкі універсітэта і кабінетаў пры кафедрах. Для іх ёсць метадычныя дапаможнікі і распрацоўкі па асобных прадметах. Высокі навукова-метадычны ўзровень чытаемых лекцый, праводзімых семінарскіх і практычных заняткаў, групавыя і індывідуальныя кансультацыі, гутаркі ў міжсесійны перыяд і дні завочніка, неабходная дапамога і кантроль за арганізацыяй самастойнай работы садзейнічаюць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**М. РАМАНОЎСКІ,**
**дэкан геафака, прафесар.**



У геалагічным музеі геафака. Фота **Д. Прэса.**

## ЖУРНАЛІСТЫКІ

35 гадоў гасцінна адкрывае свае дзверы для новага папаўнення студэнтаў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Наш факультэт быў створан у 1944 годзе, у цяжкі час Вялікай Айчыннай вайны. І гэта яшчэ адзін пераканаўчы доказ увагі і клопату Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб развіцці друку ў Беларусі. Такім чынам, факультэт журналістыкі БДУ з'явіўся родапачальнікам факультэтаў журналістыкі нашай краіны, створаных пры універсітэтах.

За многія гады сваёй дзейнасці факультэт выхаваў вялікі атрад ідэалагічных работнікаў —больш як 2000 чалавек з дыпломамі журналіста працуюць у рэдакцыях газет і часопісаў, кніжных выдавецтвах, на радыё і тэлебачанні Беларусі, а таксама ў шматлікіх кутках нашай вялікай Радзімы.

Сярод выпускнікоў факультэта нямала партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх работнікаў, пісьменнікаў, дзеячаў навукі і культуры. Для прыкладу можна назваць некалькі прозвішчаў: Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Філімонаў, карэспандэнт «Праўды» па Беларусі, лаўрэат прэміі імя П. М. Лепяшынскага, пісьменнік І. Г. Новікаў, карэспандэнты «Известий» па Беларусі Н. Е. Матукоўскі і М. М. Шыманскі, рэдактар газеты «Чырвоная змена» В. Касько, міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, старшыня Дзяржкамвыдавецтва БССР М. І. Дзялец.

На факультэце ў цяперашні час працуюць чатыры кафедры. Акрамя гэтага, у падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў актыўную ролю адыгрываюць агульнауніверсітэцкія кафедры —дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, гісторыі філасофіі, гісторыі КПСС, палітэканоміі, навуковага камунізму, замежных моў, а таксама кафедры філалагічнага факультэта.



**Па новаму вучэбнаму плану, уведзенаму ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія вынікаюць з пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» (студзень 1975 г.), студэнты за гады знаходжання ва універсітэце вывучаюць грамадска-палітычныя і грамадска-адукацыйныя дысцыпліны: гісторыю КПСС, марксісцка-ленінскую філасофію, палітычную эканомію, навуковы камунізм, логіку, савецкае права, партыйнае і савецкае будаўніцтва, сучасную рускую мову, сучасную беларускую мову, практычную стылістыку і літаратурнае рэдагаванне і інш. Значная колькасць гадзін адводзіцца на спецыяльныя журналісцкія дысцыпліны, да якіх адносяцца. гісторыя журналістыкі, гісторыя партыйнага і савецкага друку, гісторыя друку БССР, гісторыя замежнага камуністычнага і рабочага друку, тэорыя і практыка савецкай журналістыкі, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, уводзіны ў журналістыку, тэхніка газетнай справы, радыёвяшчання і тэлебачання, журналісцкае майстэрства (індывідуальная работа са студэнтамі).**

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва значна ўзрасла роля масавых сродкаў інфармацыі. Натуральна, узрасла і роля тых кадраў, якія працуюць ці будуць працаваць у рэдакцыях газет, часопісаў, радыёвяшчання, тэлебачання, выдавецтвах, тэлеграфным Агенцтве.

Значна павысілася адказнасць факультэтаў і аддзяленняў журналістыкі, якія заклікаць

## ПРАВАЗНАЎСТВА

XXV з'езд КПСС паставіў задачу ўсямернага замацавання сацыялістычнай законнасці ў нашай краіне і павышэння прававой культуры сярод насельніцтва. У выкананні гэтай адказнай задачы прымаюць удзел партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і праваахоўныя органы. Важная роля ў гэтай справе належыць калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта, а таксама выпускнікам факультэта, якія працуюць у органах суда, пракуратуры і Міністэрства ўнутраных спраў.

Юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта з'яўляецца галоўным цэнтрам у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы высокакваліфікавных спецыялістаў па правазнаўству. Тысячы юрыстаў з дыпломамі нашага універсітэта працуюць у партыйных і савецкіх органах, у судах, пракуратуры, адвакатуры, навуковых установах, на прадпрыемствах і ў гаспадарчых арганізацыях. Такое шырокае прымяненне спецыяльнасці юрыста дае магчымасць кожнаму выпускніку выбраць сабе работу па сваіх здольнасцях і схільнасцях.

Гісторыя нашага факультэта пачынаецца з 1921 года, калі ў Белдзяржуніверсітэце быў створан факультэт грамадскіх навук (ФГН), дзе было аддзяленне права. Затым на базе гэтага аддзялення быў створан факультэт права і гаспадаркі, на базе якога былі створаны два самастойныя інстытуты: народнай гаспадаркі і інстытут савецкага будаўніцтва і права. У 1954 годзе юрыдычны інстытут зноў уліўся ў састаў Белдзяржуніверсітэта.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па адной спецыяльнасці — правазнаўству. Тэрмін навучання на завочным факультэце — 6 год.

У цяперашні час на 7 кафедрах факультэта працуюць вядомыя ў Савецкім Саюзе вучоныя. Большасць з іх — выпускнікі нашага факультэта.

Навучанне праходзіць цікава. Студэнты авалодваюць ведамі па гісторыі дзяржавы і права замежных краін, Савецкага Саюза, у тым ліку і Беларусі, па тэорыі дзяржавы і права, гісторыі палітычных вучэнняў. Асаблівую цікавасць у студэнтаў выклікае вывучэнне спецыяльных юрыдычных дысцыплін — дзяржаўнага, крымінальнага, грамадзянскага, адміністратыўнага, міжнароднага права, крыміналістыкі. Шмат увагі ўдзяляецца вывучэнню працоўнага права, грамадзянскага і крымінальнага судаводства, пракурорскаму нагляду.

На старэйшых курсах прадугледжана спецыялізацыя навучання па трох спецыяльнасцях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой і судова-пракурорска-следчай. У працэсе навучання студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыкі ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, у юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.



Лабараторыя крыміналістыкі юрфака.

Фота **Д. Прэса.**

У сувязі з тым, што работа следчага, суддзі, пракурора, адваката патрабуе не толькі юрыдычных ведаў, але і пэўнага практычнага і жыццёвага вопыту, правіламі прыёму на юрыдычны факультэт устаноўлены некаторыя перавагі для асоб, якія маюць стаж работы або праслужылі ва Узброеных Сілах СССР.

**В. ЧЫГІР,**
**дэкан юрфака,**
**прафесар.**

# ЗАПРАШАЕ НА АДДЗЯЛЕННІ:

рыхтаваць высокакваліфікаваных работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Гэтыя кадры павінны спалучаць у сабе высокія ідэйна-маральныя якасці і прафесіянальнае майстэрства. Асаблівая ўвага звяртаецца на тое, каб забяспечыць дасканалае засваенне будучымі работнікамі масавых сродкаў інфармацыі тэорыі марксізму-ленінізму, гістарычнага вопыту КПСС, унутранай і знешняй палітыкі партыі, метадаў ідэалагічнай работы.

Выкладчыкі факультэта робяць усё для таго, каб дапамагчы будучым работнікам друку, радыё і тэлебачання глыбей авалодаць ленінскім майстэрствам палітычнага пераканання мас, вучыцца звязваць прапаганду камуністычных ідэалаў з рашэннем практычных задач, пераканаўча, з наступальных пазіцый весці барацьбу з ідэалагічнымі праціўнікамі.

Падрыхтоўка журналістаў на факультэце вядзецца па трох формах навучання: дзённай, вячэрняй і завочнай (6 год). Вучэбны працэс праходзіць з наступнай спецыялізацыяй: літаратурная работа ў газетах і часопісах, літаратурная работа на радыёвяшчанні, літаратурная работа на тэлебачанні.

На працягу вучобы студэнты вядуць актыўную навукова-даследчую работу ў навуковых гуртках, займаюцца грамадскай работай.

**У адпаведнасці з Правіламі прыёму на навучанне без адрыву ад вытворчасці (завочная форма) прымаюцца асобы без абмежавання ўзросту, якія праявілі здольнасці да літаратурнай дзейнасці і паспяхова здалі ўступныя экзамены.**

**У першую чаргу залічваюцца работнікі друку, радыёвяшчання, тэлебачання і выдавецтваў, якія маюць працоўны стаж па выбранай спецыяльнасці не менш 6 месяцаў.**

Паступаючыя на ўсе формы навучання здаюць уступныя экзамены па рускай мове і літаратуры ці (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна і пісьмова), гісторыі СССР (вусна), адной з замежных моў (вусна).

**Прыём дакументаў на завочную форму з 20 красавіка па 31 мая, а ўступныя экзамены праводзяцца з 1 па 20 чэрвеня.**



Цікава ідуць заняткі па тэорыі і практыцы радыёвяшчання і тэлебачання.

Фота **Д. Прэса.**

Гэты артыкул адрасаван тым, хто цвёрда вырашыў стаць журналістам, актыўным байцом нашай партыі. І мы сардэчна запрашаем іх на факультэт журналістыкі.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**дэкан журфака, прафесар.**

## БІЯЛОГІІ

**Падрыхтоўка спецыялістаў на білагічным аддзяленні вядзецца па двух асноўных напрамках. З аднаго боку, атрымліваюць магчымасць павысіць узровень біялагічных ведаў і прафесійнае майстэрства настаўнікі школ горада і рэспублікі, з другога боку, набываюць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі работнікі розных біялагічных і медыка-біялагічных устаноў (навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, санітарна-эпідэміялагічных станцый, клінічных лабараторый і г. д.).**

**Да работы на завочным факультэце прыцягваюцца вядучыя спецыялісты кафедр факультэта, бо пры адносна невялікіх аб'ёмах лекцыйных курсаў і практыкумаў студэнты-завочнікі павінны атрымаць поўнае ўяўленне аб сучасным узроўні біялагічных ведаў, навейшых дасягненнях у розных галінах біялогіі, азнаёміцца з новымі метадамі даследаванняў.**

**Значнае месца ў вучэбным плане адводзіцца вучэбным і вытворчым практыкам. Ужо на працягу многіх гадоў летняя вучэбная практыка студэнтаў І і ІІ курсаў праводзіцца на біялагічнай станцыі возера Нарач. Агульная працягласць практыкі па заалогіі і батаніцы павялічана да 10 дзён. Гэта дазваляе ўключыць у праграму практыкі шырокае азнаямленне з фаунай і флорай Беларусі, назіранне жывых аб'ектаў у прыродзе, вывучэнне складаных узаемаадносін арганізмаў у біяцэнозах.**

**З IV курса студэнты-завочнікі пачынаюць спецыялізавацца на кафедрах факультэта. Па матэрыялах, сабраных у час вытворчай практыкі, яны пішуць курсавыя і дыпломныя работы. Пры вызначэнні тэматыкі работ кафедрамі, як правіла, улічваецца характар асноўнай работы студэнтаў. Для завочнікаў, якія працуюць у школе, разам з даследчымі прапаноўваюцца тэмы па методыцы выкладання бялогіі, што садзейнічае дасканаленню іх прафесійнага майстэрства ў працэсе навучання.**

**Студэнты, якія працуюць у навукова-даследчых установах, засвойваючы новыя метады навуковых даследаванняў на кафедрах факультэта, маюць магчымасць шырока прымяняць іх у сваёй асноўнай рабоце.**

**Паказчык сур'ёзных рэзультатаў даследчай работы студэнтаў-завочнікаў — удзел многіх з іх у штогадовым рэспубліканскім аглядзе навуковых студэнцкіх работ, выступленні іх на навуковых студэнцкіх канферэнцыях ВНУ рэспублікі і Саюза.**

**Многія выпускнікі біялагічнага аддзялення завочнага факультэта працягваюць работу ў выбранай галіне біялогіі. Некаторыя з іх паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі і актыўна працуюць у ВНУ і навукова-даследчых установах рэспублікі.**

**А. ПІКУЛЕЎ,**
**дэкан біяфака, прафесар.**

## ФІЛАЛОГІІ

Гісторыя філалагічнага аддзялення пачынаецца з 1922 года, калі адкрыўся педагагічны факультэт з некалькімі аддзяленнямі, у ліку якіх было і літаратурна-лінгвістычнае. Першымі выкладчыкамі літаратурна-лінгвістычнага аддзялення былі народны паэт Беларусі К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), акадэмік АН БССР І. І. Замоцін, прафесары Е. І. Барычэўскі, А. Н. Вазнясенскі, П. А. Бузук, М. М. Піятуховіч. Філалагічны факультэт з'яўляецца адным з вядучых цэнтраў рэспублікі па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне філалогіі.

**Падрыхтоўка спецыялістаў праводзіцца па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры. Па кожнай з гэтых спецыяльнасцей праводзіцца навучанне па стацыянарнай, завочнай і вячэрняй формах.**

На філалагічных аддзяленнях завочнага факультэта грунтоўна вывучаюцца грамадскія навукі: гісторыя КПСС, марксісцка-ленінская філасофія, палітычная эканомія, навуковы камунізм і іншыя. Незалежна ад абранай спецыяльнасці ўсе студэнты вывучаюць адну з замежных моў (англійскую, нямецкую, французскую або іспанскую), а таксама лацінскую мову.

**Сярод філалагічных дысцыплін, якія студэнт-завочнік вывучае на працягу ўсяго перыяду навучання, выдзяляюцца дзве групы: лінгвістычная (моўная) і літратуразнаўчыя. Вывучэнне лінгвістычных дысцыплін пачынаецца з уводзін у мовазнаўства, славянскай філалалогіі і стараславянскай мовы, пасля чаго студэнты вывучаюць курсы сучаснай беларускай і рускай моў і іх гісторыю, дыялекталогію (навуку пра народныя гаворкі), культуру мовы.**

Засвойваючы літаратуразнаўчыя навукі, студэнты вывучаюць уводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю крытыкі, вусную народную творчасць, гісторыю беларускай і рускай літаратуры, сучасную савецкую літаратуру і інш. На старэйшых курсах студэнтам прапануюцца дысцыпліны спецыялізацыі па лінгвістыцы, літаратуразнаўству і літаратурна-мастацкай крытыцы. На завочным факультэце студэнтамі-філолагамі вывучаюцца яшчэ псіхолага-педагагічныя і прававыя дысцыпліны (псіхалогія, педагогіка, методыка выкладання мовы і літаратуры і савецкае права).

**У. ЛАЗОЎСКІ,**
**намеснік дэкана філфака, дацэнт.**

## ГІСТОРЫІ І ФІЛАСОФІІ

**Камуністычная партыя і Савецкі ўрад надаюць вялікае значэнне падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці. Завочная форма навучання — спрыяльны шлях павышэння кваліфікацыі для тых, хто працуе па выбранай спецыяльнасці, і добрая магчымасць набыць новую спецыяльнасць.**

**Вучэбны план для завочнікаў разлічан на 6 год навучання, па свайму зместу ён амаль не адрозніваецца ад вучэбнага плана стацыянара.**

**На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта навучаецца больш чым 800 студэнтаў, здзяйсняецца падрыхтоўка гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства для агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Многія выпускнікі аддзялення гісторыі працуюць навуковымі супрацоўнікамі архіваў, музеяў і навукова-даследчых інстытутаў, у партыйных, савецкіх і камсамольскіх органах, экскурсаводамі ў экскурсійных і турысцкіх арганізацыях.**

**Пачынаючы з IV курса, студэнты размяркоўваюцца па групах спецыялізацый, дзе паглыбляюць свае веды па пэўных галінах гістарычнай навукі. Спецыялізацыя будуецца такім чынам, каб эфектыўна садзейнічаць павышэнню кваліфікацыі або набыццю новай спецыяльнасці. Так, настаўнікі школ могуць спецыялізавацца па гісторыі СССР і БССР, работнікі партыйных, камсамольскіх органаў — па гісторыі КПСС. Для іх чытаюцца спецкурсы па тэорыі партыйна-камсамольскай работы. Кафедра новай і навейшай гісторыі шляхам спецыялізацыі рыхтуе лектараў-міжнароднікаў. Мэтай спецыялізацыі па гістарычнаму краязнаўству з'яўляецца падрыхтоўка кадраў для экскурсійных бюро, музеяў, таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.**

**Студэнты-завочнікі двойчы ў год, у студзені і ліпені, збіраюцца на сесіі. У гэты час яны слухаюць лекцыі, наведваюць семінарскія і практычныя заняткі, кансультуюцца ў выкладчыкаў, здаюць залікі і экзамены. У міжсесійны перыяд выконваюць кантрольныя і курсавыя работы, самастойна рыхтуюцца да сесіі. Здаваць экзамены можна і ў дні завочніка, якія праводзяцца ў пэўныя дні месяца.**

**Чытанне лекцый, правядзенне семінарскіх і практычных заняткаў здзяйсняецца высокакваліфікаванымі выкладчыкамі гістарычнага факультэта і агульнауніверсітэцкіх кафедр.**

**Студэнты-гісторыкі прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце і навуковым жыцці гістарычнага факультэта. Штогод дзесяткі студэнтаў-завочнікаў выступаюць на навуковых канферэнцыях. Многія прымаюць удзел у рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх навуковых работ і дабіваюцца высокіх вынікаў.**

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістфака, прафесар.**

**На аддзяленні філасофіі завочнага факультэта навучаецца каля 300 студэнтаў. Яны атрымліваюць шырокую гуманітарную адукацыю, вывучаюць шэраг філасофскіх дысцыплін, марксісцка-ленінскую метадалогію, гісторыю культуры, этыку, эстэтыку і г. д. Працэс духоўнага развіцця розных краін, усяго чалавецтва раскрываецца пры вывучэнні курсаў гісторыі філасофіі, пачынаючы са старажытных часоў і да нашых дзён. У вучэбны план уключаны таксама асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі і іншых прыродазнаўча-навуковых дысцыплін.**

**Тых, каго вабіць філасофія, хто жадае пазнаць таямніцы яе гісторыі, мы гасцінна запрашаем на аддзяленне філасофіі завочнага факультэта.**

**Шырокая гуманітарная адукацыя, высокая ідэйна-тэарэтычная падрыхтоўка робяць выпускнікоў-філосафаў спецыялістамі шырокага профілю. Выпускнікі аддзялення працуюць выкладчыкамі філасофіі, грамадазнаўства, этыкі, эстэтыкі ў прафесійна-тэхнічных вучылішчах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, сацыёлагамі на прадпрыемствах і ва ўстановах, у савецкім, партыйным і камсамольскім апараце.**

**Вучэбны працэс на аддзяленні забяспечваюць супрацоўнікі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі і логікі, навуковага камунізму, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, палітычнай эканоміі.**

**А. КЛЯЦКОЎ,**
**намеснік дэкана гістфака, дацэнт.**



У час археалагічнай практыкі.

Фота **Д. Прэса.**

# Па педагогіцы—выдатна

## (РАЗВАЖАННІ ПАСЛЯ СЕСІІ)

ЗІМОВАЯ марозная раніца. Усе спяшаюцца на свае рабочыя месцы. Горад жыве, працуе.

Я таксама спяшаюся на экзамен да студэнтаў IV курса фізічнага факультэта.

Толькі ўвайшоўшы ва універсітэт, чуеш стрыманы гоман. Амаль ля кожнага акна, кожных дзвярэй — групы студэнтаў. Яны то паўтараюць вывучанае, то паспешліва гартаюць канспекты і кнігі, то аб нечым спрачаюцца.

Узнімаюся на трэці паверх фізічнага корпуса. Каля 375-й аўдыторыі натоўп студэнтаў. Яны здаюць педагогіку. Адразу за першай «пяцёркай» заходжу ў аўдыторыю. Там ужо ўсё падрыхтавана да прыёму экзамена: акуратна раскладзены білеты, праграмы, чырвоныя гваздзікі падкрэсліваюць урачыстасць і адказнасць прадстаячага выпрабавання. Дацэнт кафедры педагогікі Н. А. Беразовін падбадзёрваючым позіркам, спакойным, прыемным голасам запрашае ўзяць білеты. Экзамен пачаўся...

Нездарма гавораць, што фізікі — народ сур'ёзны. Адказы студэнтаў вызначаюцца канкрэтнасцю, лагічнасцю і, што асабліва радуе, самастойнасцю меркаванняў, выказваннем сваіх думак па таму альбо іншаму пытанню.

Па адказах студэнтаў можна меркаваць, што яны глыбока ўсведамляюць важнасць і неабходнасць ведаў методыкі работы з такім складаным аб'ектам выхавання, як дзіцячы калектыў. Радасна адзначыць, што будучыя настаўнікі нядрэнна разбіраюцца ў сутнасці і значэнні вядучых праблем савецкай педагогікі, знаёмы з важнейшымі першакрыніцамі па тэорыі выхавання і навучання. Многія студэнты з цікавасцю прачыталі літаратуру, якая раскрывае майстэрства вядомых педагогаў. Напрыклад, студэнт А. Додзь адказы на асноўныя пытанні білета «XXV з'езд КПСС аб комплексным падыходзе да выхавання» і «Урок як асноўная форма вучэбнай работы ў школе і асноўныя патрабаванні да яго» звязаў з кнігай В. Тартакоўскага «Аповесць аб настаўніку В. А. Сухамлінскім».

Загадчык кафедры педагогікі прафесар М. У. Піскуноў, які прысутнічаў на экзамене, задаваў будучым спецыялістам пытанні, патрабуючыя творчага падыходу. Адказы многіх студэнтаў паказалі ўменне крытычна падысці да вырашэння асобных пытанняў.

Поўнымі і змястоўнымі адказамі парадавалі студэнты В. Саковіч, Е. Храмовіч, В. Доктарава, М. Дацэнка, І. Палачаніна і іншыя.

Вялікая заслуга ў гэтым дацэнта Н. А. Беразовіна, лекцыі якога (а мне ўдалося прысутнічаць на многіх з іх) вызначаюцца высокім метадычным узроўнем, канкрэтнасцю, яркасцю прыкладаў, сувяззю з жыццём. У іх адлюстраваны ідэі класікаў марксізму-ленінізму па вядучых праблемах камуністычнага выхавання, матэрыялы XXV з'езда КПСС, важнейшыя пастановы і рашэнні партыі і ўрада, якія асвятляюць асноўныя бакі работы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

На наступны дзень наведала экзамен па педагогіцы ў студэнтаў IV курса механіка-матэматычнага факультэта (прымаў дацэнт Н. А. Белавусаў). Добрае ўражанне пакінулі адказы замежных студэнтаў Нгуен Ба Тхі з В'етнама, Дабу II Секу з Гвінеі. Радавала тое, што ідэі А. С. Макаранкі, Н. К. Крупскай і іншых савецкіх педагогаў блізкія і зразумелыя ім. Яны расказалі таксама аб сістэме народнай адукацыі ў іх краінах. Дабу II Секу сказаў: «У нашай краіне яшчэ шмат неадукаваных, і я пасля заканчэння універсітэта абавязкова буду настаўнікам у сябе на радзіме».

Аднак належыць адзначыць, што не ўсе студэнты ў поўнай меры авалодалі асновамі педагагічнай навукі, педагогікі школы. Пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў патрэбна ўдзяляць больш увагі вывучэнню ідэй вядомых савецкіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў і педагогаў Н. К. Крупскай, М. І. Калініна, А. В. Луначарскага і іншых па кардынальных пытаннях камуністычнага выхавання і адукацыі; партыйных дакументаў аб школе, аб сувязі педагагічнай тэорыі з жыццём, аб фарміраванні педагагічнага мыслення.

**А. КАНАВАЛЬЧЫК,**
**выкладчык кафедры педагогікі.**

# АЎГУСТ УЛАДЗІМІРАВІЧ КАНСТАНЦІНАЎ



**6 лютага на 50-м годзе жыцця раптоўна памёр загадчык кафедры дарвінізму і генетыкі БДУ, доктар біялагічных навук, прафесар Аўгуст Уладзіміравіч Канстанцінаў.**

**А. У. Канстанцінаў нарадзіўся ў г. Архангельску ў сям'і служачых. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1949 годзе паступіў у Ленінградскі дзяржуніверсітэт імя А. А. Жданава, які скончыў у 1954 годзе па спецыяльнасці біёлаг-дарвініст-генетык.**

**Навуковая дзейнасць А. У. Канстанцінава пачалася ў 1955 годзе. Прапрацаваўшы некаторы час пасля заканчэння універсітэта на пасадзе старшага лабаранта лабараторыі пладоваягадных культур Майкопскай станцыі ВІРа, ён у 1955 годзе паступіў у аспірантуру. У 1959 годзе А. У. Канстанцінаў паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю «Біялогія цвіцення і апладнення некаторых сартоў яблыні».**

**У 1961 годзе А. У. Канстанцінаў выбіраецца на пасаду в. а. дацэнта кафедры дарвінізму і генетыкі БДУ імя У. І. Леніна, і з таго часу яго жыццё і дзейнасць непарыўна звязаны з Мінскам, са старэйшай ВНУ рэспублікі. З верасня 1970 года ён выконваў абавязкі загадчыка кафедры, а з 1974 года пасля абароны доктарскай дысертацыі і прысваення звання прафесара загадваў кафедрай дарвінізму і генетыкі.**

**Вялікую ўвагу А. У. Канстанцінаў удзяляў падрыхтоўцы кадраў высокай кваліфікацыі (пад яго кіраўніцтвам абаронены 4 і выконваліся 3 кандыдацкія дысертацыі), вучэбна-метадычнай рабоце са студэнтамі.**

**Яго пяру належаць манаграфія «Мяйоз» (1971), шэраг шырока вядомых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў: «Агульная цыталогія» (1966, 1968), «Цытагенетыка» (1971), «Асновы эвалюцыйнай тэорыі» (1975), «Біялогія індывідуальнага развіцця» (1978), звыш 60 навуковых артыкулаў.**

**Актыўнай і шматграннай была яго грамадская дзейнасць. А. У. Канстанцінаў з'яўляўся членам праўлення Беларускага аддзялення таварыства генетыкаў і селекцыянераў, членам навукова-тэхнічнага савета пры МВ і ССА БССР, членам савета па прысуджэнню кандыдацкіх (БДУ) і доктарскіх (Інстытут генетыкі АН БССР) ступеней, выбіраўся народным засядацелем раённага суда, з 1977 года на грамадскіх асновах загадваў аддзелам цытагенетыкі раслін ЛЭБ БДУ. На працягу шэрагу год з'яўляўся нязменным куратарам СНТ факультэта, членам рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ».**

**За заслугі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і бездакорную работу А. У. Канстанцінаў неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі МВ і ССА БССР. У 1970 годзе ён быў узнагароджан медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».**

**Заўчасна пайшоў з жыцця таленавіты вучоны, цудоўны педагог і выхавацель, чалавек вялікіх душэўных якасцей.**

**Светлая памяць аб Аўгусце Уладзіміравічу Канстанцінаве назаўсёды застанецца ў сэрцах яго вучняў, усіх тых, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.**

# ТАК ТРЫМАЦЬ!




**Закончыўся традыцыйны турнір па міні-футболу на прыз лётчыка-касманаўта СССР П. І. Клімука, арганізаваны рэдакцыяй газеты «Вячэрні Мінск» і абласным саветам «Буравеснік». У турніры прынялі ўдзел зборныя каманды па футболу ВНУ г. Мінска і лепшыя каманды прадпрыемстваў Мінска — удзельнікі першынства БССР па футболу.**

**Вельмі ўдала закончыўся гэты турнір для зборнай нашага універсітэта: яна стала пераможцай. Рабяты правялі за час турніру 8 сустрэч. У сямі з іх яны перамаглі і толькі з камандай фізкультурнага інстытута сыгралі ўнічыю. Агульная розніца мячоў у нашай каманды 63:20.**

**Роўна і ўпэўнена правялі нашы рабяты ўсе сустрэчы, турнір абышоўся без вострых драматычных калізій. І вось названы лепшыя ігракі турніру. Імі сталі нашы футбалісты. Прыз лепшага варатара атрымаў студэнт II курса геафака Ю. Петухоў, а лепшым бамбардзірам турніру назван студэнт IV курса гістфака В. Зіноўчык.**

**Пасля турніру мы сустрэліся з капітанам каманды Віктарам Блізнюком.**

**— ВІКТАР, РАСКАЖЫЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ЧЫМ АБУМОЎЛЕНЫ ПОСПЕХ НАШАЙ КАМАНДЫ?**

**— Апошнія гады наша каманда ўпэўнена выходзіла ў фінал спаборніцтваў. У 1975 і 1976 гадах мы былі пераможцамі першынства рэспублікі сярод ВНУ. І вось у гэтым годзе — зноў перамога. Мы лічым, што яна не выпадковая. У нашай каманды добрыя традыцыі, калектыў вельмі дружны, іграе з энтузіязмам, са студэнцкім запалам. Наша перамога — гэта вынік агульных намаганняў, важкі ўклад кожнага спартсмена ў агульную справу.**

**У камандзе ў асноўным студэнты прыродазнаўчых факультэтаў. Таму зразумела, як цяжка сумяшчаць ім заняткі спортам з паспяховай вучобай. А вучоба ў нас і сапраўды паспяховая. Экзамены здаём на добра і выдатна. Тройка — выключна рэдкая адзнака ў нашай камандзе. Ёсць у нас і выдатнікі. Вось, напрыклад, студэнт III курса ФПМ Сяргей Гняўко можа пахваліцца тым, што ў яго залікоўцы толькі пяцёркі. Трэба адзначыць, што і турнір Сяргей правёў на выдатна.**

**Паспяхова сумяшчаюць заняткі са спортам і студэнты Віктар Паўлавец (V курс фізфака), Валодзя Гамеза (IV курс хімфака). Валодзя актыўна займаецца і грамадскай работай: ён староста групы.**

**Штогод каманда папаўняецца новымі ігракамі. Як правіла, гэта ўжо добра падрыхтаваныя спартсмены. Трэба адзначыць, што папаўненне — агульны наш клопат.**

**У мінулым годзе на базе нашай каманды была сфарміравана зборная каманда СДСТ «Буравеснік», якая стала пераможцай гарадской спартакіяды сярод таварыстваў.**

**З 1962 года нашу каманду трэніруе Віталій Данілавіч Ліштван. Добрыя арганізатарскія і спартыўныя якасці, вялікі вопыт работы дапамаглі яму згуртаваць калектыў, выхаваць моцную футбольную каманду.**

**— ВІКТАР, РАСКАЖЫЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АБ БУДНЯХ КАМАНДЫ, АБ ТЫМ, ЯК ПРАХОДЗЯЦЬ ТРЭНІРОЎКІ.**

**— Я ўжо адзначаў, што поспех наш дасягнут агульнымі намаганнямі, упартай работай кожнага. На трэніроўкі прыходзяць усе і адносяцца да іх вельмі сур'ёзна. На жаль, час для трэніровак у нас не вельмі зручны. Яны пачынаюцца ў 21.30, заканчваюцца апоўначы, а раніцай нам трэба спяшацца на заняткі, на работу. Таму не заўсёды паспяваем добра адпачыць, а адпачынак для спартсмена — рэч не апошняя.**

**Не ўсё добра і з матэрыяльным забеспячэннем каманды. Да гэтага часу мы не маем аднолькавых трэніровачных касцюмаў, таму на фоне іншых каманд выглядаем не лепшым чынам.**

**Хацелася б паспрачацца на футбольным полі з камандамі іншых рэспублік, але паездкі за межы Беларусі для нас пакуль што рэдкасць. Калі так будзе працягвацца і далей, наша каманда страціць магчымасць росту, удасканалення свайго спартыўнага майстэрства.**

**— КАЛІ ЛАСКА, ВІКТАР, НЕКАЛЬКІ СЛОЎ АБ ПЛАНАХ НА БУДУЧАЕ.**

**Перамога на гэтым турніры нас вельмі радуе, але гэта не галоўнае. Наперадзе — першынство ВНУ рэспублікі. І мы прыкладзём усе намаганні, каб яно прайшло для нашай каманды не менш паспяхова.**

**Л. АНДРЭЕВА.**

# КЛУБ ТВОРЧАЙ І НАВУКОВАЙ МОЛАДЗІ

Пры ЦК ЛКСМБ працуе «Клуб творчай і навуковай моладзі», мэтай якога з'яўляецца фарміраванне ў моладзі марксісцка-ленінскага светапогляду, ідэйнай перакананасці, удасканаленне маральнага, ідэйна-эстэтычнага выхавання. Штогод у верасні праходзяць выязныя творчыя семінары, удзельнікі якіх могуць абмяняцца думкамі па хвалюючых пытаннях, праслухаць даклады па актуальных праблемах навукі, тэхнікі і мастацтва, абмеркаваць новыя работы прадстаўнікоў творчай моладзі.

Нядаўна ў Рэспубліканскім Доме мастацтваў адбыўся справаздачна-выбарны сход членаў клуба, на якім са справаздачай аб рабоце ў 1978 годзе выступіў А. Акенцьеў. Інструктар аддзела навуковай моладзі ЦК ЛКСМБ Л. В. Белая ўручыла граматы ЦК ЛКСМБ актывістам клуба. Было выбрана праўленне клуба творчай і навуковай моладзі ЦК ЛКСМБ. Старшынёй стаў Уладзімір Дарохін, адказны сакратар Саюза кампазітараў БССР; намеснікамі—А. Акенцьеў, архітэктар, В. Куўшынаў, кандыдат фізіка-матэматычных навук і Л. Турбіна, супрацоўнік Інстытута генетыкі АН БССР.

На гэтым жа пасяджэнні член-карэспандэнт АН БССР А. П. Іваноў расказаў аб выніках навуковай экспедыцыі ў раён Бермудскіх астравоў, якая праходзіла па праграме «Палімода» і была прысвечана вывучэнню падводных віхраў.

У гэтым годзе на пасяджэннях клуба творчай і навуковай моладзі, якія праводзяцца штомесячна, будуць выступаць акцёры тэатра-студыі пры кінастудыі «Беларусьфільм», маладыя кампазітары і паэты, будзе расказана аб рабоце і адпачынку супрацоўнікаў НДІ сродкаў аўтаматызацыі, пройдзе паказ новых фільмаў маладых беларускіх кінематаграфістаў.

**Т. ДАНІЛЕНКА,**
**член савета маладых вучоных БДУ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 237. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 10096